Мікола Савіцкі, прафесар
Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт/

# АСНОЎНАЕ ПАТРАБАВАННЕ ДА АДУКАЦЫЙНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТА*

Аб'ектыўныя законы і практыка развіцця сістэмы выхавання і навучання ва ўсіх вольных і незалежных ад імперыяў краінах свету прывялі да ўсталявання выхавання і навучання на роднай нацыянальнай мове. Для карэннага этнасу родная і нацыянальная мовы супадаюць, ёсць адно і тое ж. На жаль, гістарычна склалася так, што 200-гадовая акупацыя Беларусі прывяла да разбурэння нацыянальнай сістэмы адукацыі, а што тычыцца вышэйшай адукацыі — да яе поўнага знішчэння. Нават на філфаках, дзе рыхтуюцца настаўнікі беларускай мовы і літаратуры, шэраг прадметаў выкладаюцца не на беларускай мове. У цэлым вышэйшая школа дзяржавы Беларусь да сёння не беларуская як па духу, так і па зместу. Такой сітуацыі напрыканцы XX стагоддзя не ведае ні адна краіна, ні адзін народ свету.

Асноўная мэта вышэйшай школы — падрыхтаваць не проста высокакваліфікаванага, а нацыянальна свядомага спецыяліста, які павінен творча-патрыятычна служыць і абараняць нацыянальныя інтарэсы краіны. Гэта дасягаецца ва ўсіх краінах свету ва ўмовах арганізацыі выхаваўча-навучальнага працэсу ў роднамоўным інфармацыйным асяроддзі. На жаль, пачалося актыўнае разбурэнне беларускай школы ў Беларусі. Узята на ўзбраенне шавіністычная тэорыя XX стагоддзя Мураў'ёва-вешальніка: тое, што не дарабіў рускі штык, завершыць расейская школа.

Роля адукацыі ў склаўшыхся ўмовах ёсць тая вышыня, за якую змагаецца, з аднаго боку, беларуская нацыянальна свядомая інтэлігенцыя, і з другога — імперска-шавіністычныя сілы. Гісторыя і педагогіка яскрава сведчаць аб вызначальнай ролі і месцы нацыянальнай ідэі ў развіцці адукацыі, пабудове дзяржаўнасці. Нацыянальная ідэя здольна аб'яднаць беларусаў дзеля выхаду з эканамічнай і духоўнай катастрофы. У гэтых умовах зніжаецца павага да беларусаў з боку суседніх народаў. Класічным прыкладам удушэння нацыянальнай ідэі карэннага этнасу з боку кіраўніка краіны з'яўляецца дабравольны адказ Урада ад спынення асіміляцыі і русіфікацыі беларусаў: у дамове паміж Беларуссю і Расеяй запісана, што бакі гарантуюць нацыянальнай меншасці захоўваць і развіваць этнічную, моўную, культурную, рэлігійную самабытнасць без асімі-

ляцыі супраць сваей волі. Аб якой волі размова? Гэта здзек са здаровага сэнсу. У педагогіцы ёсць палажэнне: лепш нічога не ведаць, чым атрымаць амаральныя веды.

Беларуская нацыянальная ідэя з улікам сённяшняга стану грамадства павінна стаць першаасновай адраджэння беларускай вышэйшай эканамічнай адукацыі. Неабходна увесці і пашыраць ужыванне паняцця геаэтнічная выратавальная прастора дзеля выратавання і захавання беларускага этнасу ад асіміляцыі, прыняць Закон па нацыянальным адраджэнні і механізм яго рэалізацыі, стварыць спрыяльныя умовы дзеля гэтага і вызначыць палітыку краіны. Роля і месца адзінага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта у гэтым вызначальная.

Беларуская нацыянальная ідэя ёсць галоўны чыннік выхавання у беларусаў адданасці сваёй нацыі, Бацькаўшчыне, патрэбнасці і гатоўнасці змагацца за волю, захаванне дзяржаўнасці і незалежнасці Беларусі. Наша нацыянальная ідэя з'яўляецца выхавацельнай духоўнасці і фізічнай моцы у барацьбе за свае правы быць роўнымі сярод роўных. Яна з'яўляецца генератарам развіцця эканамічнай школы як па змесце, так і па духу. Апошняя адчыняе дзверы для свабоднага і творчага развіцця асобы, таму што яна /асоба/ вучыцца і выхоўваецца на лепшых нацыянальных традыцыях свайго роднага народа.

Паняцці беларускай нацыянальнай ідэі і нацыянальнай эканамічнай беларускай школы -- дзве паралельныя лініі, якія пры нармальным гарманічным іх развіцці ніколі не перасякаюцца і высвечваюць шлях развіцця беларускага народа. Сёння няма беларускай эканамічнай нацыянальнай школы у Беларусі, а ёсць толькі падрыхтоўка эканамістаў манкуртаў-янычараў. Яны рыхтуюцца ва умовах рускамоўнай рэзервацыі.

Нацыянальная ВНУ закладвае падмурак свайго роднага, нацыянальнага -- таго, што адрознівае аднаго чалавека ад другога і дазваляе з глыбокай павагай адносіцца да усяго сусвецця народаў свету. Толькі веданне нацыянальнай культуры і поўнавартаснае жыццё у ёй адчыняе дзверы да творчага пазнання сусветнай культуры, навукі.

ж

Дадзена у аутарскай рэдакцыі.